Список использованной литературы
1. Стругова, Г. С. Экспрессивный синтаксис поэтической речи: материалы факультативного курса : учеб.-практич. пособие для студентов филологического факультета педагогических вузов / Г. С. Стругова. – Челябинск : Южно-Уральский гос. гум.-пед. ун-т, 2021. – 79 с.

# АСНОВАСЛОВАСКЛАДАННЕ
# ЯК СПОСАБ УТВАРЭННЯ НЕАЛАГІЗМАЎ

**Шпакевіч Яніна (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт**

Адным са спосабаў утварэння неалагізмаў у мове беларускай публіцыстыкі з'яўляецца асновасловаскладанне – важны інструмент папаўнення лексічнага складу беларускай мовы, які дазваляе значна скарачаць інфармацыю.

Асновасловаскладаннем даследчыкі называюць «спосаб словаўтварэння, пры якім з двух утваральных слоў адно цалкам уваходзіць у наватвор і складае яго апорны кампанент, а з другога бярэцца толькі аснова, якая выконвае ролю першага кампанента» [1, с. 41].

Неалагізмы-кампазіты шырока адзначаюцца ў сістэме прыметніка. Яны абазначаюць:

а) колер: *зялёна-белы* ‘з чаргаваннем зялёнага і белага колераў’: *У нас пейзажы спрэс* ***зялёна-белыя*** (Звязда. 2024. 10 крас. С. 16); *насычана-сіні* ‘насычаны сінім колерам’: ***насычана-сінія,*** *васільковыя сапфіры («Мы вырошчваем менавіта сінія сапфіры, яны цэняцца ў ювелірнай справе», – тлумачыць суразмоўнік.)* (Звязда. 2025. 30 студз. С. 13); *насычана-зялёны* ‘насычаны зялёным колерам’, *празрыста-блакітны* ‘светлага блакітнага колеру’: *Ювеліры ведаюць: ізумруды (ад светлых да* ***насычана-зялёных****) ды яшчэ тапазы (пяшчотнага* ***празрыста-блакітнага*** *тону) – найбольш запатрабавыныя ва Усходняй Еўропе з каляровых камянёў, таму што пасуюць да славянскага тыпу знешнасці* (Звязда. 2025. 30 студз. С. 13);

б) паняцці са сферы адукацыі: *карэкцыйна-развіццёвы* ‘які накіраваны на выпраўленне якіх-небудзь адхіленняў у развіцці’: *Цэнтр* ***карэкцыйна-развіццёвага*** *навучання і рэабілітацыі Слонімскага раёна працуе па запытах бацькоў* (Настаўніцкая газета. 2024. 23 крас. С. 5); *прадметна-развіццёвы* ‘арганізацыйна афармлены і прадметна насычаны, прыстасаваны для задавальнення патрэб дзіцяці ў пазнанні, зносінах, працы, фізічным

і духоўным развіцці ў цэлым’: *У Краснасельскай сярэдняй школе прадставілі арганізацыю* ***прадметна-развіццёвага*** *асяроддзя* (Настаўніцкая газета. 2024. 23 крас. С. 5);

в) паняцці з галіны турысцкай індустрыі: *турыстычна-інфармацыйны* ‘які выконвае інфармацыйную ролю ў турыстычнай галіне’: *...19 красавіка будзе прысвечаны дзелавому, прамысловаму, адукацыйнаму турызму,* ***турыстычна-інфармацыйным*** *цэнтрам, якія пачалі адкрывацца летам* (Звязда. 2024. 18 крас. С. 3); *турыстычна-краязнаўчы* ‘які адносіцца да пазнання культурнай спадчыны і прыродных багаццяў пэўнага рэгіёну’: *Акрамя таго, тут дзейнічае заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорнага тэатра моды «Спадчына», развіваецца* ***турыстычна-краязнаўчы*** *напрамак.* (Настаўніцкая газета. 2024. 23 крас. С. 5);

г) біялагічныя паняцці: ***ростастымуляцыйны*** ‘стымуляцыйны для росту каго- або чаго-небудзь’: *У першую чаргу гаворка ідзе пра біялагічна актыўныя і* ***ростастымуляцыйныя*** *гумінавыя субстраты* (Звязда. 2024. 19 крас. С. 4);

д) паняцці з галіны здабываючай прамысловасці: *нафтаперспектыўны* ‘перспектыўны па здабычы нафты’: *Па словах Марыі Шастак, пасля работ на* ***нафтаперспектыўнай*** *структуры «Жукоўская» забяспечаны прырост рэсурсаў нафты (па катэгорыі D0) у колькасці 457 тысяч тон* (Звязда. 2024. 10 крас. С. 4);

е) паняцці з галіны міжнародных сувязей: *экспартна-імпартны* ‘які адносіцца да экспарту і імпарту’: *Мяркуецца, што выкарыстанне біржавага механізма спросціць працу кампаній з М’янмы на рынку Беларусі, а таксама забяспечыць празрыстасць цэнаўтварэння, кантроль выканання абавязацельстваў і дадатковыя інструменты страхавання рызык пры заключэнні* ***экспартна-імпартных*** *здзелак* (Звязда. 2025. 12 сак. С. 6) і інш.;

ж) эстэтычна-сацыяльныя паняцці: *прыгожа-безабаронны* ‘прыгожы, але безабаронны’: *Праз тыдзень-другі яна стане больш яркай, упэўненай і не такой* ***прыгожа-безабароннай*** (Звязда. 2024. 10 крас. С. 16).

Нярэдка фіксуюцца таксама неалагізмы-кампазіты, утвораныя асноваслоўскладаннем, у сістэме назоўніка і абазначаюць:

а) прыродныя з’явы: *вільгацетрываласць* ‘вільгацеўстойлівасць’: *Унясенне торфу эфектыўна паляпшае баланс перагною і спрыяе павышэнню* ***вільгацетрываласці*** (Звязда. 2024. 19 крас. С. 4); *грунтасумесь* ‘сумесь глебы, пяску і торфу’: ***Грунтасумесь*** *для ўкаранення павінна быць друзлай і паветрапранікальнай, для гэтага ў яе дадаюць буйназярністы пясок і нейтральны торф* (Звязда. 2024. 13 чэрв. С. 16);

б) псіхалагічныя паняцці: *стрэсаўстойлівасць* ‘уласцівасць стрэсаўстойлівага’: *Удзел у інтэлектуальных гульнях вельмі важны для алімпіяднікаў, бо развівае кемлівасць і хуткасць мыслення, а таксама фарміруе* ***стрэсаўстойлівасць*** (Настаўніцкая газета. 2024. 22 ліст. С. 13).

Такім чынам, асновасловаскладанне – жывы і прадуктыўны спосаб утварэння слоў у мове сучаснай беларускай публіцыстыкі. Ён дазваляе ствараць новыя словы, якія канцэнтруюць вялікі аб’ём інфармацыі і адлюстроўваюць змены ў грамадстве, у развіцці навукі і тэхнікі.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (дагавор № 1410/2021).

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Солахаў, А. В. Наватворы ў мове беларускай публіцыстыкі пачатку XXI ст. / А. В. Солахаў, Б.А. Крук. – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2021. – 160 с.

## ТЕОРЕТИКО-ЛИТЕРАТУРНАЯ СОСТАВЛЯЮЩАЯ В ОБРАЗОВАТЕЛЬНОМ ПРОЦЕССЕ СРЕДНЕЙ ШКОЛЫ

**Ящиковская Илона (УО МГПУ имени И.П. Шамякина, г. Мозырь)**
**Научный руководитель – С.Б. Кураш, д-р филол. наук, доцент**

Теоретико-литературная составляющая в образовательном процессе средней школы представляет собой важный аспект формирования культурного и интеллектуального потенциала учащихся. Цель этой составляющей заключается в том, чтобы вооружить школьников необходимыми знаниями о литературе, а также развить у них навыки критического анализа текстов. Это требует знакомства с основными понятиями, теоретическими подходами и историческими контекстами литературного творчества.

Учебный процесс включает в себя изучение различных литературных жанров, течений и направлений, что позволяет ученикам понять, как литература отражает жизнь и культуру общества. Знакомство с классическими произведениями, а также современными авторами дает учащимся возможность увидеть динамику развития литературного процесса и его связи с другими сферами жизни. Это изучение помогает формировать в них интерес к чтению и дает возможность развивать собственную интеллектуальную и эмоциональную сферу.

Одной из основных задач теоретико-литературной составляющей является обучение учащихся анализу текстов. Это включает в себя не только